

У ГЭТАЙ ШКОЛЫ ЁСЦЬ БУДУЧЫНЯ

2

СЯРГЕЯ ПРЫТЫЦКАГА ПАМЯТАЮЦЬ НА ГРОДЗЕНШЧЫНЕ

4





Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

+TV ПРАГРАМА

15 ВЕРАСНЯ 2023 г. ПЯТНІЦА № 179 (30059)


## ЦЫТАТА ДНЯ



**Леанід МАРТЫНЮК, памочнік Прэзідэнта — інспектар па Магілёўскай вобласці:**

*«У перыяд санкцый мы не толькі выстаялі, але і палепшылі эканоміку шэрагу прадпрыемстваў. Мы навучыліся працаваць у новых умовах. І гэта таксама адзінства. Эканамічныя рычагі і механізмы, якія прымае дзяржава і Прэзідэнт, павінны выконвацца. Час няпросты, таму сёння, як ніколі, трэба быць адзінымі. Важна быць разам і так выбудоўваць палітыку, каб мы жылі пад мірным небам у эканамічна моцнай незалежнай дзяржаве».*

## КОРАТКА

- Аляксандр Лукашэнка накіраваў спачуванне народу Лівіі ў сувязі з ахвярамі стыхійнага бедства.
- **Кожныя выхадныя з 16 верасня да 26 лістапада ў Мінску будуць працаваць сельгаскірмашы.**
- Беларускія зенітчыкі прыбылі на расійскі палігон Тэлемба для ўдзелу ў вучэнні.
- **У Доме кіно адбудзецца прэм'ерны паказ гістарычнай драмы «На іншым беразе».**
- Мемарандум аб узаемаразуменні падпісаны паміж БДЭУ і бразільскім Федэральным універсітэтам Мінас-Жэрайс.
- **У Беларусі амаль на 10 працэнтаў знізілася колькасць злачынстваў сярод непаўналетніх.**
- У Жодзіне абнавілі манумент у гонар маці-патрыёткі.
- **Першае пасяджэнне 11 сесіі Савета Рэспублікі сёмага склікання адбудзецца 19 верасня.**
- Тыдзень мабільнасці пройдзе ў Мінску з 16 да 22 верасня.


ISSN 1990 — 763X


# Справа для напарнікаў



Фота БелТА.

**У Нацыянальным аэрапорце Мінск прайшоў семінар-трэнінг для кінолагаў. Практычная частка ўключала тактыку прымянення службовых сабак для пошуку выбуховых рэчываў і наркотыкаў у грузавым самалёце. Удзельнікамі трэнінгу сталі прадстаўнікі Дзяржпагранкамітэта, Дзяржаўнага мытнага камітэта і Службы авіяцыйнай бяспекі са сваімі чатырохлапымі напарнікамі. Сярод іх — нямецкія аўчаркі, малінуа, а таксама няўрымслівы джэк-расел-тэр'ер.**

З нагоды

## ЗАХАВАЦЬ ГІСТОРЫЮ ДЛЯ НАШЧАДКАЎ

### Напярэдадні Дня народнага адзінства адбылася рэспубліканская навукова-практычная канферэнцыя

**Навуковы форум «Дзяржаўная палітыка ў сферы гісторыі: праблемы і перспектывы захавання гістарычнай праўды і памяці», арганізаваны Нацыянальнай акадэміяй навук, Акадэміяй кіравання пры Прэзідэнце і Беларускім дзяржаўным універсітэтам, аб'яднаў прадстаўнікоў кіраўніцтва рэспубліканскіх органаў дзяржаўнага кіравання, Нацыянальнага сходу, абласных і Мінскага гарадскога выканаўчых камітэтаў, устаноў вышэйшай адукацыі, музеяў, архіваў, грамадскіх аб'яднанняў, сродкаў масавай інфармацыі, а таксама навуковую і экспертную супольнасці.**

Падчас пленарнага пасяджэння і работы трох профільных секцый абмяркоўваліся праблемы навукова-тэарэтычнага і інфармацыйна-ідэалагічнага забеспячэння рэалізацыі дзяржаўнай гістарычнай палітыкі ў Беларусі, а таксама пытанні яе ўкаранення ў сістэму адукацыі. Выступоўцы закранулі найбольш актуальныя праблемы гістарычнай палітыкі — у выніку будуць выпрацаваны новыя падыходы ў развіцці гістарычнай свядомасці.

СТАР. 3

## Удзячная памяць

### Рэпартаж з вуліцы 17 Верасня

**Вуліца 17 Верасня размешчана ў гістарычным цэнтры Брэста. З абодвух бакоў стаяць двух- і трохпавярховыя дамы, на сценах якіх спрэс таблічкі з папярэджаннем, што будынак з'яўляецца гісторыка-культурнай каштоўнасцю.**





Вуліца даволі ціхая і спакойная. На ёй няма прадпрыемстваў і арганізацый, зусім мала ўстаноў, юрыдычным адрасам якіх значыцца названая вуліца. Калі ж паварочваеш на 17 Верасня з праспекта Машэрава, амаль адразу кідаецца ў вочы дагледжаны двухпавярховы будынак вясёлай расфарбоўкі. Гэта дзяржаўная ўстанова дашкольнай адукацыі «Дзіцячы садок № 6 г. Брэста». Сюды і завітала карэспандэнт газеты, каб пазнаёміцца з гаспадарамі ўстановы.

СТАР. 4


ЗВЯЗДА Да чытача з любоўю!

СА «ЗВЯЗДОЙ» ЦЯПЛЕЙ І ЎТУЛЬНЕЙ!

Ідзе падпіска на IV квартал 2023 года.

ЗАСТАВАЙЦЕСЯ З НАМІ ВОСЕННЮ І ЗІМОЙ. БУДЗЕ ЦІКАВА!

Афіцыйна

## Аляксандр Лукашэнка правядзе перагаворы з Уладзімірам Пуціным

Прэзідэнт Беларусі ўчора прыбыў з рабочым візітам у Расійскую Федэрацыю. Цэнтральнай часткай візіту стануць перагаворы з Прэзідэнтам Расіі Уладзімірам Пуціным. Перагаворы лідараў дзвюх краін пройдуць сёння, 15 верасня. Сустрэчу прэзідэнты запланавалі раней у адпаведнасці з графікам сустрэч двух лідараў. Асноўнымі тэмамі перагавораў стануць міжнародны парадак дня і рэгіянальная праблематыка. А таксама сумесныя задачы ў эканоміцы, у прыватнасці ў прамысловасці, сельскай гаспадарцы і іншых галінах. Кіраўнікі дзяржаў абмяркуюць і агульную вялікую работу ў сферы імпартазамяшчэння.

Найлепшыя

## СІМВАЛ ДАВЕРУ

Прэм'ер-міністр Беларусі ўручыў дзяржаўныя ўзнагароды.

**По даручэнні Прэзідэнта Беларусі ў Палацы Рэспублікі заслужаныя дзяржаўныя ўзнагароды прадстаўнікам розных сфер дзейнасці, тым людзям, якія сваёй працай уносяць важкі ўклад у развіццё сучаснай Беларусі, уручыў прэм'ер-міністр Беларусі Раман ГАЛОЎЧАНКА, паведаміла БелТА.**



Фота БелТА.

«Напярэдадні дзяржаўнага свята — Дня народнага адзінства — дзяржаўныя ўзнагароды ўручаны прафесіяналам, чые заслугі і ўклад у развіццё роднай краіны адзначаныя дзяржавай», — падкрэсліў Раман Галоўчанка. Прэм'ер-міністр адзначыў, што сярод узнагароджаных «асабліва шмат дзяржаўных служачых, удастоеных узнагарод за ўзорнае выкананне сваіх службовых абавязкаў і значныя дасягненні ў дзяржаўнай грамадзянскай службе. Дзяржаўны служачы, выконваючы ролю правадніка перайтварэнняў ва ўсіх сферах грамадскага жыцця, з'яўляецца своеасаблівым люстэркам, якое адлюстроўвае палітыку дзяржавы. Тут прадстаўнікі розных дзяржаўных органаў, але ўсіх вас аб'ядноўвае тое, што кожны дзень вы ставіце інтарэсы дзяржавы вышэй за асабістыя», — падкрэсліў кіраўнік урада і пажадаў з годнасцю насіць званне дзяржаўнага служачага.

Таксама прэм'ер-міністр звярнуўся да работнікаў сферы культуры, чыя праца адзначана медалём Францыска Скарыны. Словы падзякі гучалі і ў адрас работнікаў прамысловасці, банкаўскай сферы, навукоўцаў.

Звяртаючыся да ўсіх, хто сабраўся на ўрачыстай цырымоніі ўручэння ўзнагарод, Раман Галоўчанка падкрэсліў: «Дзяржаўная ўзнагарода — гэта не толькі знак прызнання працоўных дасягненняў і заслуг, але і сімвал даверу і шчырай падзякі з боку ўсяго нашага грамадства за працу тым, хто ў гэты няпросты час ставіць інтарэсы краіны вышэй за ўсё і аддае ўсе свае сілы на карысць будучыні Радзімы».

# Адкрыты дыялог

**Старшыня Савета Рэспублікі Наталля КАЧАНАВА з рабочым візітам наведала Наваполацк. У Палацы культуры ААТ «Нафтан» старшыня верхняй палаты парламента сустрэлася з актывам Беларускага саюза жанчын Віцебскай вобласці.**




Фота БелТА.

— Я вельмі даўно з'яўляюся членам Беларускага саюза жанчын і ганаруся гэтым. Лічу, што наша арганізацыя можа многае, а калі аб'ядноўваюцца жанчыны, яны вырашаюць вельмі важныя і патрэбныя задачы для краіны ў цэлым і для асобна ўзятага чалавека. Мы правялі ўжо тры такія сустрэчы: у Брэсцкай, Гродзенскай і Гомельскай абласцях, і, спадзяюся, сёння мы з вамі адкрыта і сумленна абмяркуем неабходныя пытанні, — адзначыла ў прывітальным слове Наталля Іванаўна.

Акцэнт адкрытага дыялогу быў зроблены на сямейных каштоўнасцях. Спікер падкрэсліла, што Усебеларускі народны сход вызначыў прыярытэты развіцця нашай краіны, адзін з іх — шчаслівая сям'я. І ў гэтай кароткай фразе — усё: наша жыццё, падтрымка сем'яў, дзеці, традыцыйныя каштоўнасці. Захаванне інстытута шлюбу, падтрымка шматдзетных сем'яў, мацярынства і дзяцінства — гэтыя і шэраг іншых пытанняў заўсёды знаходзяцца ў цэнтры ўвагі кіраўніка краіны і ўрада.

Старшыня Савета Рэспублікі закранула тэму дэмаграфічнай бяспекі. «Такімі льготамі і прэферэнцыямі, якія ёсць у нас, нямногія дзяржавы могуць пахваліцца. У Беларусі выплачваюцца розныя віды дапамог. Усе пытанні, якія вырашаюцца ў сферы аховы здароўя, адукацыі, органамі працы і абароны, сёння накіраваны на падтрымку сем'яў», — адзначыла Наталля Качанава.

Спікер заклікала жаночую грамадскасць сваімі прыкладамі шчаслівых сем'яў і паспяховай рэалізацыі на прафесійнай ніве дапамагчы вырашыць пытанні, якія сёння ўзнікаюць у краіне. Напрыклад, якімі спосабамі павысіць нараджальнасць. Толькі агульнымі сіламі і зацікаўленасцю ў вырашэнні агульнахвалюючых праблем можна зрабіць нашу краіну лепшай.

На сустрэчы з актывам БСЖ Наталля Качанава анансавала мерапрыемства, якое плануюць правесці ў Полацку: размова пра галоўнае з сем'ямі, на якой будуць абмяркаваны пытанні выхавання падрастаючага пакалення.

**Аляксандра ГВОЗДЗЕВА.**

Добрая навіна

## У ГРОДЗЕНСКІМ РАЁНЕ ПАСЛЯ РЭКАНСТРУКЦЫІ АДКРЫЛІ СПАРТЫЎНЫ КОМПЛЕКС

**У Луцкаўлянскай сярэдняй школе, што ў Гродзенскім раёне, урачыста адкрылі пасля рэканструкцыі спартыўны комплекс з футбольным полем і шматфункцыянальнай пляцоўкай, паведаміла БелТА.**

Як упэўнены **старшыня Гродзенскага аблвыканкама Уладзімір КАРАНІК**, у гэтай школы ёсць будучыня. «55 гадоў — гэта далёка не мяжа і школа будзе развівацца далей. Сумеснымі намаганнямі мы можам многае: аператыўна вырашаць шматлікія пытанні і рабіць жыццё нашых людзей лепшым, больш бяспечным, цікавейшым, — адзначыў старшыня Гродзенскага аблвыканкама. — Я ўпэўнены, што на гэтай пляцоўцы будуць пастаянна гучаць радасныя дзіцячыя галасы. Для кагосьці гэта стане першым крокам спартыўнай славы, для ўсіх астатніх гэта магчымасць усебаковага гарманічнага развіцця, здароўя будучых пакаленняў».

Пры будаўніцтве аб'екта дапамогу па пастаўцы штучнага пакрыцця міні-футбольнай пляцоўкі аказала Беларуская федэрацыя футбола, па пастаўцы спартыўнага сілавога абсталявання для шматфункцыянальнай пляцоўкі — Прэзідэнцкі спартыўны клуб у рамках рэспубліканскага сацыяльнага праекта па падтрымцы спорту і здаровага ладу жыцця «Спорт для ўсіх». Агульны кошт рэалізацыі праекта склаў каля Br910 тыс.

На цырымоніі прысутнічаў і **старшыня Нацыянальнай дзяржаўнай тэлерадыёкампаніі Іван ЭЙСМАНТ**. «Радасна ўсіх бачыць сёння тут, вельмі радасна пабываць у сваёй роднай вёсцы. Тым больш сёння такая выдатная падзея — адкрыццё новага спартыўнага комплексу. Першыя думкі пра ідэю рэканструкцыі паўсталі, калі быў абвешчаны Год малой радзімы. Я б хацеў падзякаваць усім, хто падтрымаў гэтую ідэю», — адзначыў ён.



Фота БелТА.

Звяртаючыся да прысутных школьнікаў, Іван Эйсмант дадаў: «Учора ўвечары я прыйшоў сюды, і тут столькі людзей было! Я думаю, што гэта будзе адно з самых папулярных месцаў у нашай вёсцы. Калі мы тут вучыліся, мы не тое што школай — мы класам выйгравалі раённыя спаборніцтвы і па футболе, і па баскетболе, і па лёгкай атлетыцы. Таму я спадзяюся, што вы падтрымаеце нашу традыцыю і Луцкаўлянская школа будзе найлепшай».

Пасля ўрачыстага адкрыцця адбыўся сяброўскі футбольны матч паміж футбольным клубам «Нёман» і зборнай камандай выпускнікоў школы і гасцей мерапрыемства.

## ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

### Інфляцыя ў ЗША ў жніўні паскорылася да 3,7 працэнта




Спажывецкія цэны (індэкс CPI) у ЗША ў жніўні ўзраслі на 3,7 працэнта адносна таго ж месяца мінулага года. Аб гэтым паведаміла міністэрства працы краіны. Інфляцыя паскорылася ў параўнанні з 3,2 працэнта ў ліпені. Кансэнсус-прагноз, які прыводзіць Trading Economics, меркаваў інфляцыю на ўзроўні 3,6 працэнта. Адносна папярэдняга месяца агульны індэкс CPI ў жніўні павялічыўся на 0,6 працэнта пасля росту на 0,2 працэнта ў ліпені, пры гэтым больш за палову жнівеньскага росту забяспечыла павышэнне цэн на бензін. Прадукты харчавання падаражэлі на 4,3 працэнта. Цэннік на адзенне «пацяжэў» на 3,1 працэнта, транспартных паслуг — на 10,3. Новыя машыны падаражэлі на 2,9 працэнта. Федэральная рэзервовая сістэма ўважліва сочыць за дадзенымі аб тэмпах росту спажывецкіх цэн у краіне, якія з'яўляюцца адным з важных фактараў у прыняцці рашэнняў адносна грашова-крэдытнай палітыкі.

### На італьянскім востраве Лампедуза абвешчаны надзвычайны рэжым з-за наплыву мігрантаў



Мэр міжземнаморскага вострава Лампедуза Філіпа Маніна абвясціў надзвычайнае становішча ў сувязі з прыбыццём на востраў на працягу сутак больш за 6 тысяч мігрантаў. Аб гэтым паведаміла газета Le Figaro са спасылкай на афіцыйнага прадстаўніка італьянскага Чырвонага Крыжа Франчэску Базіле. «Ці не перажывае Еўропа самую вялікую міграцыйную хвалю ў сваёй сучаснай гісторыі?» — задае пытанне Le Figaro. Цэнтр па прыёме мігрантаў на Лампедузе, які разлічаны на 400 месцаў, не ў стане прыняць усіх, хто прыбыў на востраў гэтым разам. Італьянскай паліцыі прыйшлося некалькі разоў умешвацца, каб стрымаць сотні мігрантаў, якія патрабавалі, каб ім далі пакінуць прычал. Не абышлося без ахвяр: пяцігадовае дзіця загінула, зваліўшыся ў ваду. Паводле даных МУС Італіі, з пачатку года ў краіну па моры прыбыло каля 118,5 тысячы мігрантаў.

### Акула напала на дзяўчыну на курорце Егіпта



На егіпецкім курорце Дахаб (размешчаны ў Паўднёвым Сінаі за 100 кіламетраў ад вядомага Шарм-эш-Шэйха) акула напала на дзяўчыну. Пра гэта паведаміла РІА «Навіны» са спасылкай на El Manshar. Як адзначыла выданне, з-за нападу пацярпелай прыйшлося ампутаваць руку. Відавочца распавёў, што акула ўкусіла дзяўчыну за плячо. Пасля таго, што адбылося, на акулу палявалі каля дзвюх гадзін. Па словах відавочцы, яе хутчэй за ўсё не злавілі, а толькі прымусілі сплысці. Міністэрства навакольнага асяроддзя Егіпта дадало, што пацярпелай егіпцянцы аказалі неабходную дапамогу, яе стан стабільны.

# ЗАХАВАЦЬ ГІСТОРЫЮ ДЛЯ НАШЧАДКАЎ

## «ДАЦЬ ПРАЎДЗІВЫЯ АДКАЗЫ»

Прывітальны адрас Прэзідэнта ўдзельнікам навукова-практычнай канферэнцыі агучыў **кіраўнік Адміністрацыі Прэзідэнта Ігар СЕРГЕЕНКА**. «Мы, беларусы, народ з багатай шматвяковай гісторыяй, — сказана ў прывітальным адрасе. — Мы ганарымся сваім мінулым, вялікімі дасягненнямі і годна пройдзенымі выпрабаваннямі нашых продкаў. Памятаем, у якіх няпростых умовах стваraўся каштоўнасны падмурак беларускай дзяржаўнасці. Сёння на яго аснове працягваем нацыянальнае будаўніцтва і ўмацоўваем суверэнітэт Беларусі. Аднак сучасныя выклікі глабальнага свету ствараюць пагрозу страты духоўна-маральнага пачатку, без якога няма будучыні ў нашага народа і краіны. Таму мы павінны больш прынцыпова і бескампрамісна адстойваць праўду, выхоўваць падрастаючае пакаленне на прыкладзе традыцыйных каштоўнасцяў беларусаў, іх геraічных і працоўных подзвігаў. Вядучая роля ў гэтай важнай місіі належыць гістарычнай навуцы. Перакананы, што канферэнцыя, якая праходзіць напярэдадні Дня народнага адзінства, стане яшчэ адным упэўненым крокам да асэнсавання эпахальных падзей мінулага, дазволіць даць адказы на самыя складаныя пытанні, паслужыць агульнай справе папулярызацыі айчыннай гісторыі».

Выступаючы з дакладам, кіраўнік Адміністрацыі Прэзідэнта звярнуў увагу на актуальнасць тэмы канферэнцыі. «Сам час прымусіў нас падысці да больш глыбокага асэнсавання сваёй гісторыі, — падкрэсліў ён. — Можна вылучыць мноства як выдатных, так і трагічных падзей, перафарматаваць іх і зрабіць ідэалагічнай зброяй, што і адбываецца. Гісторыю Беларусі старанна вывучаюць за мяжой, пішуць, трактуюць у інтарэсах палітыкі сваіх дзяржаў і часта наўмысна скажаюць гістарычныя факты, ствараюць міфы, якія агрэсіўна навязваюцца нашаму грамадству, у тым ліку з мэтай дыскрэдытацыі нашага гераічнага мінулага».

Прыводзячы прыклады маніпуляцыі гістарычным мінулым, Ігар Сергеенка перакананы: праблема ў тым, што інфармацыя, якая не адпавядае рэчаіснасці, знаходзіцца ў адкрытым доступе. «Людзі бачаць, чытаюць, абмяркоўваюць і, што самае страшнае, пачынаюць сумнявацца, — канстатаваў ён. — Іх замбіруюць, шмат у чым губляецца вера ў афіцыйныя крыніцы інфармацыі. І мы павінны даць адказы на многія складаныя пытанні нашай гісторыі — праўдзівыя адказы, без палітычных падтасовак».

У гэтым плане зроблена ўжо нямала, у тым ліку дзякуючы намаганням Рэспубліканскага савета па гістарычнай палітыцы. «У першую чаргу вызначаны падыходы да фарміравання і ўмацавання дзяржаўных гістарычных канцэптаў, выпрацаваны механізмы іх укаранення ў навучальны працэс устаноў адукацыі і выкарыстання ў арганізацыі ідэалагічнай і выхаваўчай работы з насельніцтвам, — канкрэтызаваў Ігар Сергеенка. — Прынята рашэнне аб аднаўленні і рэканструкцыі аб'ектаў гістарычнай спадчыны краіны, унесены карэктывы ў арганізацыю экскурсійнай дзейнасці».

Кіраўнік Адміністрацыі Прэзідэнта вызначыў прыярытэтныя кірункі гістарычнай палітыкі. Сярод іх — папулярызацыя канцэпцыі гісторыі беларускай дзяржаўнасці, прасоўванне нацыянальных традыцый і свят самабытнай культуры.

## «БЕЛАРУСКІ ПОГЛЯД НА ГІСТОРЫЮ НАРОДА І ДЗЯРЖАЎНАСЦІ»

**Рэктар Акадэміі кіравання пры Прэзідэнце Вячаслаў ДАНІЛОВІЧ** прадставіў нацыянальную канцэпцыю айчыннай гісторыі, якая адлюстроўвае беларускі погляд на ўласнае гістарычнае мінулае. Сакратар Рэспубліканскага савета па гістарычнай палітыцы засяродзіў увагу на актуальнасці барацьбы з перапісваннем гісторыі. «У цэлым спробы скажэння, фальсіфікацыі гістарычнага мінулага савецкага народа назіраюцца даўно, — адзначыў ён. — Таму ў Беларусі выключна важна рэалізоўваць дзяржаўную гістарычную палітыку, накіраваную перш за ўсё на супрацьстаянне такім спробам. У першую чаргу мы павінны дакладна сфарміраваць свой беларускі погляд на гісторыю нашага народа і нашай дзяржаўнасці. Вядома, падыход павінен быць аб'ектыўным, але любы гістарычны факт, падзея можа мець розную інтэрпрэтацыю і па-рознаму ўплываць на лёсы народаў і дзяржаў. Таму для нас важна глядзець на гісторыю з пункту гледжання нашых продкаў, нашага народа».

Па словах Вячаслава Даніловіча, неабходна працягваць максімальна транслiраваць аб'ектыўныя падыходы і пункт гледжання на гістарычныя факты. «Мы нічога не скажаем і не фальсіфікуем, мы не выкраслілі з нашай гісторыі ніводнага гістарычнага перыяду, у адрозненне ад многіх нашых суседзяў, якія не хочуць успамінаць савецкі час, — канкрэтызаваў кандыдат гістарычных навук. — На ўсе перыяды глядзім аб'ектыўна, але з пункту гледжання беларускага народа, таго, як пэўная падзея або дзеяч паўплывалі на нашу гісторыю».

Рэктар адзначыў важнасць адлюстравання нацыянальнай канцэпцыі айчыннай гісторыі ў сістэме адукацыі. Вялікая роля ў данясенні аб'ектыўных ацэнак гісторыі, на яго думку, належыць і сродкам масавай інфармацыі.



Фота БелТА.

## РЭАЛЬНЫ МАШТАБ ТРАГЕДЫІ

Аб ходзе і выніках расследавання крымінальнай справы аб генацыдзе беларускага народа ў гады Вялікай Айчыннай вайны і пасляваенны перыяд расказаў **намеснік генеральнага пракурора Аляксей СТУК**. «Штодня пракуроры, следчыя, эксперты, прадстаўнікі Міністэрства абароны, гісторыкі, архівісты ў рамках работы следчай групы Генеральнай пракуратуры ўстанаўліваюць новыя факты злачынстваў нацыстаў і іх памагатых, — паведаміў ён. — Гэтая праца асабліва актуальная ў святле сённяшняй міжнароднай абстаноўкі, калі ў некаторых краінах нацызм зноў робіць спробы адраджэння пры актыўнай падтрымцы і садзейнічанні Захаду».

Падчас расследавання высвятляюцца невядомыя дагэтуль факты масавага знішчэння нацыстамі грамадзянскага насельніцтва Беларусі. Праводзіцца карпатлівая праца па фіксацыі інфармацыі ад відавочцаў тых падзей, іх сваякоў. Вывучаны вялікі масіў архіўных дакументаў і тысячы крымінальных спраў у дачыненні да нацысцкіх злачынцаў. Праведзена больш за 400 аглядаў месцаў здарэнняў, падчас якіх устаноўлены невядомыя раней месцы масавага забойства мірных грамадзян. Устанаўліваюцца акалічнасці знішчэння населеных пунктаў. «Усе мы ведаем лёс Хатыні і яе жыхароў, аднак такіх трагічных гісторый яшчэ нямала, — падкрэсліў Аляксей Стук. — Шляхам допытаў і вывучэння архіўных дакументаў атрыманы звесткі аб спаленні яшчэ больш як 2 тысяч населеных пунктаў».

Відавочна, што маштабы трагедыі беларускага народа ў гады Вялікай Айчыннай вайны значна большыя, чым меркавалася раней, — аб гэтым сведчаць доказы, атрыманыя падчас расследавання. «Устаноўлена, што ў гады нацысцкай акупацыі на тэрыторыі Беларусі забіта не менш чым тры мільёны мірных жыхароў і ваеннапалонных, сагнана ў нямецкае рабства больш за 380 тысяч чалавек, многія з якіх памерлі ад невыносных умоў, — паведаміў намеснік генпракурора. — Масавы характар насіў і выган на прымусовыя работы дзяцей. Часта дзеці выкарыстоўваліся ў якасці донараў. Разбурана звыш 200 гарадоў, у тым ліку такія буйныя, як Мінск, Гомель, Віцебск, спалены тысячы паселішчаў і вёсак».

Аляксей Стук звярнуў увагу на тое, што ў генацыдзе мірнага насельніцтва бралі ўдзел не толькі нямецка-фашысцкія захопнікі, але і іх еўрапейскія саюзнікі — літоўскія, латышскія, украінскія паліцэйскія батальёны, польскія нацыяналісты. Генпракуратурай накіравана 106 просьбаў аб аказанні прававой дапамогі ў дзясяткі дзяржаў, у тым ліку аб допытах асоб, якія ўваходзілі ў склад карных батальёнаў. Сярод іх — Літва, Латвія, Канада, ЗША, Вялікабрытанія, Аргенціна, Бразілія, Аўстралія і іншыя краіны. Многія праігнаравалі просьбу аб аказанні прававой дапамогі.

## «НЕ ДАПУСЦІЦЬ СКАЖЭННЯ ГІСТАРЫЧНАЙ ПАМЯЦІ»

Як адзначыў у размове з журналістамі **намеснік кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта Ігар ЛУЦКІ**, трэба беражліва ставіцца да гісторыі. Прычым, па яго словах, кожны яе перыяд трэба асэнсаваць з пункту гледжання нацыянальных прыярытэтаў і інтарэсаў: не азірацца па баках, ісці сваёй дарогай. «Мы становімся мудрэйшымі, і ў дэзынфармацыі ўсё менш шанцаў паўплываць на наша грамадства, — перакананы намеснік кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта. — Пачалі працаваць з моладдзю, падрастаючым пакаленнем. Стараемся не ўпусціць ніякую мэтавую аўдыторыю, каб данесці дзяржаўную пазіцыю. Усё, што добра для дзяржавы, — добра для кожнага чалавека. Усё, што добра для чалавека, — добра і для суверэнітэту» .

Ігар Луцкі звярнуў увагу на тое, што ў нашай краіне захаванню гістарычнай памяці ўдзяляецца асаблівая ўвага. «Перш за ўсё, гэта захаванне памяці аб нашых вялікіх перамогах, Вялікай Айчыннай вайне, — удакладніў ён. — Нельга не сказаць пра вялікае свята, якое будзе 17 верасня, — Дзень народнага адзінства. Гэта вялікая заслуга нашага народа, што мы шануем і памятаем гэтыя святы. Насамрэч, трэба зрабіць яшчэ вельмі шмат. Самае галоўнае — не дапусціць скажэння нашай гістарычнай памяці, бо мы бачым, як лёгка ламаецца свядомасць людзей, як лёгка ўкараняюцца абсалютна непрымальныя для нас, беларусаў, ідэі, якія могуць прывесці да разбурэння нашай дзяржавы. Нам гэтага дапусціць, вядома ж, нельга».

**Міністр інфармацыі Уладзімір ПЯРЦОЎ** акцэнтаваў увагу на тым, што ў эпоху постпраўды і фэйкаў з'явілася шмат альтэрнатыўнай гістарычнай «праўды». «Мы гэтую няпраўду развенчваем сваімі матэрыяламі, публіцыстыкай, дакументальнымі фільмамі, малымі журналісцкімі формамі, спецрэпартажамі і сюжэтамі, — канстатаваў кіраўнік ведамства. — Мы робім усё, каб нашым людзям расказаць пра тое, што было на нашай зямлі, чым мы можам ганарыцца і што ніколі не павінна паўтарыцца. Па-першае, асвятляем падзеі, якія адбываюцца ў нашай краіне, — гэта значыць, ствараем гісторыю сваімі матэрыяламі. Падругое, мы ўздымаем пласт гістарычнай праўды і даносім яго сродкамі, якія даступны журналістам друкаваных і электронных сродкаў масавай інфармацыі, да шырокіх пластоў насельніцтва».

Па выніках навукова-практычнай канферэнцыі была прынята рэзалюцыя. Плануецца, што даклады выступоўцаў увойдуць у зборнік — такім чынам, у кожнага з'явіцца магчымасць дакрануцца да абмеркавання найважнейшых пытанняў гістарычнай палітыкі.

**Вераніка КАНЮТА.**

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

# НОВЫЯ ТРАДЫЦЫІ

**Адзіны ўрок памяці да Дня народнага адзінства пройдзе ва ўстановах адукацыі Беларусі 15 верасня.**

Акрамя таго, на працягу ўсяго тыдня ва ўстановах адукацыі праходзяць святочныя мерапрыемствы: конкурсы сачыненняў, мастацкіх работ, малюнкаў, тэматычныя мерапрыемствы спартыўнай накіраванасці, фестывалі, даследчыя канферэнцыі. Шосты школьны дзень напярэдадні дзяржаўнага свята будзе таксама цалкам прысвечаны дадзенай тэме.

Пройдуць тэматычныя мерапрыемствы і ва ўсіх установах вышэйшай адукацыі. Так, у БДУ 15 верасня адбудзецца ўрачыстая лінейка ва ўнутраным дворыку з удзелам студэнтаў, выкладчыкаў і кіраўніцтва ВНУ. Даведацца пра багацце беларускай песеннай і фальклорнай спадчыны і паслухаць выкананне народных кампазіцый можна будзе падчас акцыі «Песні маёй Беларусі: спяваем разам». Таксама ў гэты дзень пярвічная арганізацыя БРСМ БДУ арганізуе патрыятычны форум «Я стаў студэнтам Беларусі». На мерапрыемстве адбудзецца сімвалічнае ўручэнне членскіх білетаў БРСМ, а таксама будзе прадстаўлены абноўлены лагатып пярвічнай арганізацыі ўніверсітэта.

Напярэдадні дзяржаўнага свята 16 верасня на факультэце філасофіі і сацыяльных навук будзе праходзіць акцыя па раздачы стужак і атрыбутыкі з элементамі дзяржаўнай сімволікі выкладчыкам і студэнтам БДУ. Таксама ўсе жадаючыя змогуць адзначыць на карце Беларусі свой родны горад у рамках акцыі «Я — з Брэста, ты — з Мазыра». А для навучэнцаў сталічных школ у парку імя М. Горкага арганізуюць квэст «Адзінства ў геаграфіі». Яго правядуць выкладчыкі факультэта геаграфіі і геаінфарматыкі. Пачатак а 12-й гадзіне.

Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка запрашае ўсіх далучыцца да дыктоўкі, прысвечанай Дню народнага адзінства, якая пройдзе 15 верасня з мэтай папулярызацыі беларускай мовы, здабыткаў нацыянальнай культуры, фарміравання патрыятызму і высокага пачуцця грамадзянскага абавязку. Мерапрыемства пачнецца а 14-й гадзіне ў аўдыторыі 330 (корпус 3). Дыктаваць тэкст будзе загадчык кафедры мовазнаўства і лінгвадыдактыкі БДПУ Дзмітрый Дзятко. Трансляцыя дыктоўкі арганізуецца таксама на афіцыйным YouTube-канале БДПУ. Да ўдзелу анлайн запрашаюцца школьнікі, студэнты, супрацоўнікі вышэйшых навучальных устаноў і ўсе ахвотныя. Па заканчэнні дыктоўкі арыгінальны тэкст будзе размешчаны на слайдзе, і ўсе ўдзельнікі змогуць самастойна праверыць узровень сваіх ведаў.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

# АДЗІНСТВА, НЕЗАЛЕЖНАСЦЬ, МІР

**У трэці раз Беларусь будзе адзначаць самае маладое свята — Дзень народнага адзінства. Урачыстыя мерапрыемствы ў паўночным рэгіёне праходзяць на працягу двух тыдняў.**


Фота БелТА.

Шэраг святочных падзей на Віцебшчыне, прымеркаваных да Дня народнага адзінства, распачаў абласны грамадзянска-патрыятычны марафон «#Адзіны», арганізатарамі якога выступілі галоўнае ўпраўленне ідэалагічнай работы і па справах моладзі Віцебскага аблвыканкама, абласная арганізацыя ГА «Беларускі саюз жанчын» і Віцебскі абласны камітэт ГА «Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі». З 5 да 13 верасня аўтацягнік праехаў па найбуйнейшых гарадах паўночнага рэгіёна. У ходзе марафону ў працоўных і студэнцкіх калектывах адбыліся круглыя сталы, была прэзентавана кніга «85 гадоў пад небам Віцебшчыны», а ў райцэнтрах урачыста адкрылі муралы, прысвечаныя Году міру і стваральнай працы.

У рамках рэспубліканскай акцыі «Сімвал адзінства — 2023» у Віцебску адкрылася абласная Алея сцягоў. Сімвалічнай падзеяй напярэдадні свята **старшыня Віцебскага аблвыканкама Аляксандр СУБОЦІН** назваў адкрыццё пасля рамонту гарадской паліклінікі № 5. «Гэта сапраўды сімвалічна, бо аб'ядналіся, уз'ядналіся калектывы, якія працавалі ў розных месцах. Важны сацыяльны аб'ект адрамантаваны, абноўлены за кошт бюджэтных грошай, тут ёсць усё для аказання якаснай медыцынскай дапамогі. За змену ва ўстанове могуць ажыццяўляць прыём каля трохсот пацыентаў. Для гэтага ёсць сучаснае абсталяванне, усе неабходныя структурныя падраздзяленні. Важна, што працэс лячэння будзе адбывацца ў прыгожым будынку. Гэта павысіць камфортнасць умоў працы для медыкаў, а значыць, станоўча адаб'ецца на якасці аказваемых паслуг». Кіраўнік вобласці падарыў кіраўніцтву Віцебскай гарадской цэнтральнай паліклінікі сертыфікат на 45 тысяч рублёў на набыццё медыцынскага абсталявання для ўкамплектавання двух кабінетаў паліклінікі.

Даніну памяці напярэдадні дзяржаўнага свята аддалі героям Вялікай Айчыннай вайны. Сёння ў аграгарадку Заронава адбылося перапахаванне астанкаў васьмі байцоў Чырвонай Арміі, якія былі знойдзены ў ходзе правядзення міжнароднай «Вахты Памяці». У Крынках Лёзненскага раёна перапахавалі астанкі 47 ахвяр Вялікай Айчыннай вайны.

17 верасня ў Парку культуры і адпачынку Наваполацка адбудзецца гарадскі фестываль «Наваполацк. Моладзь. Адзінства», Верхнядзвінскі раён запрашае на рэгіянальнае свята песні «Збіраем зорны карагод» у Вальнцах. У аг. Ноўка Віцебскага раёна прыхільнікаў здаровага ладу жыцця збярэ лёгкаатлетычны забег «Ноўкінская вярста». У Полацкім раёне на Кургане Неўміручасці будзе рэалізаваны рэспубліканскі праект «Захаваем гісторыю!», на Чашніччыне 17 верасня пройдзе аўтапрабег па памятных мясцінах раёна «Разам — мы адзіныя». Святочныя мерапрыемствы ў горадзе на Дзвіне пройдуць на працягу дня на розных пляцоўках, а вечарам над Віцебскам заззяе святочны салют.

**Аляксандра ГВОЗДЗЕВА.**


Фота «Витебские вести».

# БАРАЦЬБІТ, ПАТРЫЁТ, ЧАЛАВЕК-ЛЕГЕНДА

## Выстава пра жыццё Сяргея Прытыцкага падарожнічае па Гродзеншчыне

**Перасоўную выставу, прысвечаную жыццю і дзейнасці Сяргея Прытыцкага, арганізаваў Гродзенскі дзяржаўны гісторыка-археалагічны музей, паведаміў карэспандэнту БелТА дырэктар музея Юрый КІТУРКА.**

«Напярэдадні Дня народнага адзінства выстава ўжо пабывала ў Астраўцы, Смаргоні, Іўі, Лідзе, — распавёў кіраўнік установы культуры. — У Гродне яна будзе прадстаўлена ў абласной філармоніі, дзе пройдзе ўрачысты сход у гонар усенароднага свята. Адразу пасля гэтага выстава адправіцца ў Свіслач, дзе будзе экспанавацца ў раённым краязнаўчым музеі, пасля чаго працягне падарожнічаць па рэгіёне».

Аўтары прадставілі матэрыялы, дакументы, фатаграфіі і іншыя экспанаты, якія распавядаюць пра перыяд барацьбы беларускага народа за ўз'яднанне, падзеі верасня 1939-га і савецкае будаўніцтва на тэрыторыі Заходняй Беларусі, ваенныя гады і пасляваеннае аднаўленне праз прызму камсамольскай, партыйнай і дзяржаўнай дзейнасці Сяргея Восіпавіча Прытыцкага.

Сярод экспанатаў — станок, які выкарыстоўваўся для друку нелегальнай літаратуры (у Гродне, на вуліцы Ласасянскай, дзейнічала адна з першых падпольных друкарняў КПЗБ). Шырока прадстаўлены транспаранты, з якімі працоўныя выходзілі на мітынгі. Галоўным патрабаваннем, пазначаным на іх, было ўз'яднанне Заходняй Беларусі з Савецкай Беларуссю, якая магла гарантаваць бяспеку шырокім масам працоўнага сялянства. Адным з лідараў гэтага руху быў Сяргей Прытыцкі.

На фота Прытыцкага, зробленым у Гродзенскай турме, куды ён быў заключаны за рэвалюцыйную дзейнасць пасля ўступлення ў 1932 годзе ў шэрагі КПЗБ і абрання сакратаром Гродзенскага акруговага камітэта камсамола, сляды жорсткага збіцця. Так польскія ўлады выбівалі паказанні. Тут жа — форма польскага паліцэйскага таго часу і побач з ёй — гумавая дубінка. Зрэшты, для падаўлення пратэстаў паліцыя магла выкарыстоўваць і агнястрэльную зброю.

У 1936-м Прытыцкі зноў трапіў у рукі паліцыі. Па заданні партыі ён страляў у Віленскім акруговым судзе ў правакатара і даносчыка, з-за якога былі арыштаваныя многія камсамольцы і камуністы. Прытыцкі параніў здрадніка ў галаву, але і сам быў паранены, арыштаваны і прысуджаны да смяротнага пакарання. Аднак польскім уладам прыйшлося перагледзець прысуд пад ціскам грамадскасці. На выставе можна ўбачыць, пад якімі лозунгамі і кумачовымі транспарантамі людзі выходзілі на мітынгі ў падтрымку Прытыцкага.

Пасля ўз'яднання Беларусі Сяргей Прытыцкі, ужо будучы на волі, працягнуў справу свайго жыцця. Менавіта ён выступіў на Народным Сходзе Заходняй Беларусі з дакладам, па якім была прынята дэкларацыя Народнага Сходу. У ёй заяўлялася: «Беларускі Народны Сход, выказваючы волю і жаданне народаў Заходняй Беларусі, аб'яўляе на ўсёй тэрыторыі Заходняй Беларусі ўсталяванне савецкай улады. З гэтага часу ўся ўлада на тэрыторыі Заходняй Беларусі належыць працоўным горада і вёскі ў асобе Саветаў народных дэпутатаў».

Пасля Вялікай Айчыннай вайны, падчас якой Прытыцкі быў адным з арганізатараў партызанскага руху, ён быў абраны спачатку другім, пасля першым сакратаром Гродзенскага абкама партыі. Пазней узначальваў Маладзечанскі, Баранавіцкі, Мінскі абкамы. З 1968 да 1971 года працаваў Старшынёй Вярхоўнага Савета БССР, намеснікам Старшыні Вярхоўнага Савета СССР.

Сяргея Восіпавіча Прытыцкага не стала 13 чэрвеня 1971-га. Тады ж яго імя было прысвоена Гродзенскаму хімічнаму камбінату (цяпер ААТ «Гродна Азот»). Напярэдадні Дня народнага адзінства на прадпрыемстве ўсталююць мемарыяльную дошку ў памяць аб палымяным патрыёце Беларусі.

# Удзячная памяць

*(Заканчэнне.*
*Пачатак на 1-й стар.)*

**Загадчыца садка Аксана БАЛАКІР** расказала, што іх дашкольная ўстанова працуе ў гэтым будынку з 1967 года. Цяпер у шасці групах выхоўваецца 109 хлопчыкаў і дзяўчынак.

— На занятках з выхаванцамі мы абавязкова гаворым пра самае маладое свята нашай краіны — Дзень народнага адзінства, — сказала Аксана Мікалаеўна. — Вядома, інфармацыю даводзім дзецям у даступным фармаце, з самымі маленькімі гаворку вядзём у форме гульні. Выкарыстоўваем разнастайныя наглядныя дапаможнікі. Адзін з іх — клумбу ў выглядзе карты Беларусі — мы ўладкавалі ў сябе на ўчастку. Клумба аснашчаная адмысловымі таблічкамі з QR-кодамі. Калі дарослы падносіць тэлефон да таблічкі, пачынаецца музычнае прадстаўленне кожнага абласнога цэнтра.

У адной з самых утульных зал установы застаём **музычнага кіраўніка дзіцячага садка Ірыну СОБАЛЬ**, якая праводзіць рэпетыцыю з выхаванцамі. Як высветлілася, ідзе падрыхтоўка да мерапрыемстваў з нагоды Дня народнага адзінства. Дзяўчынкі з сярэдняй групы — Карына Саўко, Арына Кунашка, Эмілія Бондар — разам з Ірынай Аляксандраўнай складаюць букет з васількоў і каласкоў. Дарэчы, у касцюмах васількоў яны яшчэ развучваюць вельмі прыгожы танец.

— З дзецьмі гаворым пра прыгажосць нашай прыроды, пра родны горад, пра сям'ю, пра бацькоў, якія працуюць і ствараюць дабрабыт, — расказвае **намеснік загадчыка садка Наталля САЎКО.** — Абавязкова паказваем на занятках нашы дзяржаўныя сімвалы. Такім чынам, думаю, закладваюцца ў свядомасці дзяцей асновы любові да Радзімы. А любоў, шанаванне і ёсць падмурак таго, што мы называем народным адзінствам. У дзень свята ў кожнай групе будуць гучаць беларускія песні, вершы на роднай мове.

З дзіцячага садка карэспандэнт сыходзіла з прыўзнятым настроем, які стварылі гэтыя мілыя «валошкавыя» дзяўчынкі, — будучыня нашай сінявокай краіны. Вецер падганяў першыя апалыя жоўтыя лісты. І вуліца выглядала па-восеньску рамантычна, мабыць, яшчэ і таму, што пры афармленні фасадаў будынкі выкарысталі даволі шмат жоўтага колеру.

Будаўнічыя работы, у асноўным па рэканструкцыі і абнаўленні будынкаў, актыўна вядуцца тут у апошнія дзесяцігоддзі. Але спецыялісты падыходзяць ашчадна да ўсіх гістарычных пазнак, якія пакінуў час. Скажам, на адным будынку знялі слой тынкоўкі і заўважылі надпісы на польскай мове і на ідышы. Фрагмент афармлення сцяны вырашылі пакінуць. Гаворка ідзе не аб адным будынку, ёсць такія пазнакі і на іншых.



У адным з дамоў доўгі час жыў вядомы брэсцкі мастак Іван Фяцісаў, аб чым сведчыць мемарыяльная дошка. А ў суседнім з гэтым доме ў польскі час працавала падпольная друкарня ЦК КПЗБ. На вуліцы 17 Верасня, дарэчы, добра захаваўся ансамбль адна-двухпавярховых жылых дамоў канца XIX — пачатку XX стагоддзяў. Некаторыя з іх аб'яднаныя ў асобныя групы. На рагу з вуліцай Будзённага, ва ўзведзеным ў 1920-я гады будынку, размяшчаўся польскі суд. У студзені 1927 года там праходзіў працэс над групай дзеячаў КПЗБ. У ліку падсудных была і Вера Харужая. У 1965 годзе на будынку ўстанавілі мемарыяльную дошку. Адным словам, гісторыяй тут дыхае ледзь не кожны камень.

У канцы сваёй прагулкі па вуліцы карэспандэнт рашыла правесці невялікую апытанку, каб высветліць, ці ведаюць мінакі, адкуль назва вуліцы.

***Ніна Майсюк, пенсіянерка:***

— Чаму ж не ведаю? Гэта маладзейшыя могуць не ведаць. А мы некалі дзецям на ўроках пра тыя падзеі расказвалі. Я заўсёды Якуба Коласа згадвала: «Нас падзялілі. Хто? Чужаніцы, чорных дарог махляры». Мае бацькі з-пад Баранавіч пра той час нямала згадвалі. Бацька, дарэчы, — выпускнік будаўнічага тэхнікума, пасля атрымання дыплома не мог атрымаць такое ж месца, якое было ў чалавека, што пазіцыянаваў сябе каталікам. Вось вам і правы чалавека. Так што аб'яднанне не стала чаканым для большасці нашых людзей.



***Віктар Пятровіч, пенсіянер:***

— 17 верасня Чырвоная Армія ўступіла на тэрыторыю Заходняй Беларусі і ўсталявала савецкую ўладу. Лічу тыя падзеі правільнымі, Беларусь стала нашмат большай, стала адзінай краінай.

***Алена, майстар салона прыгажосці:***

— Думаю, у нас усе ведаюць, што гэта дзень уз'яднання Заходняй і Усходняй Беларусі, якое адбылося ў 1939 годзе.

З Аленай цяжка не пагадзіцца.

**Святлана ЯСКЕВІЧ,**
**фота аўтара.**

На адной хвалі

# Беларускае радыё правядзе святочную акцыю

**Рэспубліканская эфірная акцыя «Дзень народнага адзінства» пройдзе 17 верасня. Радыёстанцыі Белтэлерадыёкампаніі запланавалі для сваёй аўдыторыі спецыяльныя выпускі перадач, прамыя ўключэнні і трансляцыі са святочных мерапрыемстваў у сталіцы і ў рэгіёнах краіны.**

Журналісты інфармацыйнай службы Першага нацыянальнага канала Беларускага радыё ў выпусках навін падвядуць вынікі рэспубліканскай акцыі «Сімвал адзінства» і шэрагу патрыятычных мерапрыемстваў, якія ладзяць грамадскія аб'яднанні краіны. А пра гістарычныя аспекты свята 17 верасня распавядуць аўтары спецыяльнага публіцыстычнага праекта «Беларусь — адзіная». Сучасныя асновы беларускай дзяржаўнасці будуць абмяркоўваць у перадачы «Акцэнты». Пра стаўленне моладзі да гісторыі і выхаванне сапраўдных патрыётаў гаворка пойдзе ў «Сямейнай праграме». Таксама ў эфіры канала даведаемся пра гучную прэм'еру фільма «На другім беразе».

Канал «Культура» да Дня народнага адзінства падрыхтаваў цыкл мастацкіх перадач. Эфір будзе напоўнены музычнымі і літаратурна-драматычнымі праграмамі, дзе знойдзе адлюстраванне ўзбагачэнне нацыянальнай культуры пасля пераломных падзей у жыцці беларускага народа. Так, аматары паэтычнага слова пачуюць фрагменты творчасці паэтаў з Заходняй Беларусі Максіма Танка, Валянціна Таўлая, Міхася Машары, якія звярталіся да тэмы ўз'яднання. Музычныя перадачы прапануюць слухачам найлепшае з твораў кампазітараў і выканаўцаў розных пакаленняў, прысвечаных адзінству беларускага народа.

Спецыяльныя праграмы і тэматычныя рубрыкі з'явяцца таксама ў эфіры радыё «Сталіца», «Радыус-FM», на міжнародным радыё «Беларусь» і на рэгіянальных радыёстанцыях Белтэлерадыёкампаніі.

**Алена ДРАПКО.**

## ШАШКІ («Звязда») Выпуск № 200

У апошні тыдзень жніўня ў Рэспубліканскім цэнтры алімпійскай падрыхтоўкі па шахматах і шашках пры падтрымцы Нацыянальнага алімпійскага камітэта Рэспублікі Беларусь прайшоў рэспубліканскі турнір па шашках-100 «Маладыя майстры». Перамогу атрымаў міжнародны майстар Аляксей Куніца (Мінск). На другім месцы майстар спорту міжнароднага класа Дзмітрый Фадзееў. Трэцім фінішаваў майстар спорту Яўген Жукоўскі.

**№ 139**



№ 139 Юрый Голікаў (Цвер)

**Белыя простыя:** c1, e1, g1, c3, d4, a5 (6)

**Чорныя простыя:** f4, h4, d6, f6, a7, b8 (6)

№ 140 Юрый Мурадаў (Барысаў)

**Белыя простыя:** g1, b2, d2, g5, a7 (5)

**Чорныя простыя:** g3, b4, d4, c5, e5, b6, h6 (7)

Пад уражаннем ад пазіцыі № 116 з выпуску № 197 ад 04.08.23. — як піша ў сваім лісце Генадзь Андрэеў з Латвіі, ён склаў сваю кампазіцыю.

**№ 141**

**Белыя простыя:** f2, d4, h4, a5, c5, b6 (6)

**Чорныя простыя:** f4, g5, d6, f6, e7, g7, d8 (7)

Цікавую пазіцыю на «Фэйсбуку» прапанаваў майстар Яўген Івашка (Дніпро).

**№ 142**

**Белыя простыя:** c1, e1, g1, d2, h2, c3, e3, g3, h4 (9)

**Чорныя простыя:** a3, e5, b6, h6, e7, b8, d8, f8, h8 (9)

Ход чорных, у іх складанае становішча, трэба быць вельмі ўважлівымі. Адразу прайграюць хады 1...b8-c7?, [ 1...f8-g7?], [ 1...e7-d6?], [ 1... h8-g7?] Знайдзіце ўдары самастойна.

У шашкі-100 кампазіцыі складзеныя вядучым рубрыкі.

**№ 143**

**Белыя простыя:** 42, 43, 44, 36, 37, 38, 26, 24, 20 (9)

**Чорныя простыя:** 33, 27, 28, 29, 22, 18, 15, 9, 10 (9)

**№ 144**

Белыя простыя: 41, 31, 30, 21, 22, 23, 24, 25, 16 (9)

**Чорныя простыя:** 45, 39, 32, 34, 12, 14, 15, 7, 9 (9)

**№ 145**

**Белыя простыя:** 21, 22, 23, 24, 25, 16, 18 (7)

**Чорныя простыя:** 42, 43, 44, 12, 7, 9, 1 (7)

**№ 146**

**Белыя простыя:** 41, 38, 33, 35, 28, 21, 22, 23, 17, 18 (10)

**Чорныя простыя шашкі:** 36, 19, 20, 12, 14, 7, дамкі: 8, 10 (8)

Ва ўсіх пазіцыях белыя пачынаюць і выйграюць. Прозвішчы чытачоў, якія дашлюць правільныя адказы, будуць апублікаваныя.

**Праверце свае рашэнні: Выпуск № 199 ад 01.09.2023.**

№ 130 19. h4-g5? e7-f6! 20. g5:e7 f8:d6 21. h6:f8 e5-f4 +

№ 131 de5, a5 (g3), f2, c3, c3+

№ 132 1. h2-g3 c7-d6 2. d4-c5 b6:d4 3. e3:e7 f8:d6 4. g3-f4 d6-c5 5. f4-e5 a5-b4 6. e5-d6 c5:e7 7. a3:c5 e7-f6 8. c5-d6 f6-g5 9. d6-c7 g5-f4 10. c7-b8 h4-g3 11. f2:h4 f4-e3 12. b8-f4 e3:g5 13. h4:f6 +

№ 133 1. e7-f8 a3:c1 2. f8:e1 c1:g5 3. a5-b6 h2:f4 4. b6-c7 b8:d6 5. f2-e3 f4:d2 6. e1:h4+

№ 134 1. 11-07 02:22 2. 44-39 35:33 3. 29:20 36:47 [ 3...25:14 4. 41-37 ] 4. 20-15 47:20 5. 15:24 x Як паведаміў Ю. Голікаў, пазіцыя амаль супадае з раней апублікаванай van Eijk S. M. — 1994 г. Там белая шашка 40 стаіць на 39.

№ 135 1. 37-31 26:39 2. 47-42 36:38 3. 19-13 08:30 4. 25:01 15:24 5. 01-40 35:44 6. 50:06 24-29 7. 06-01 29-33 8. 01-34 33-38 9. 34-48 38-43 10. 48:39+

№ 136 1. 38-33 39:28 2. 48-43 24:33 3. 37-31 26:39 4. 47-42 36:38 5. 30-24 19:30 6. 25:01 15:24 7. 01-40 35:44 8. 50:06 24-29 9. 06-01 29-33 10. 01-34 33-38 11. 34-48 38-43 12. 48:39+

№ 137 1. 20-14 23:21 2. 14:05 06:28 3. 05:25 27-32 4. 25-20 32-37 5. 20-47 x

№ 138 1 .49-44 40:27 2. 20-14 23:21 3. 14:05 06:28 4. 05:25 27-32 5. 25-20 32-37 6. 20-47+

Першымі дакладныя адказы даслалі: Ф. Карпей, Л. Жыхар (абодва — Мядзел), Э. Дамброўскі, П. і В. Шульгі (усе — Мінск), У. Панько (Каменец), І. Ананіч (Гродна), С. Рашэцін (Ашмяны), В. Таўкачоў (в. Уздзевічы, Клімавіцкі р-н, Магілёўская вобл.).

**Пішыце на адрас: газета «Звязда», г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10А, 220013, e-mail: info@zviazda.by або vorush@yandex.ru.**

**Віталь ВАРУШЫЛА, майстар спорту.**







# ПРА ШТО РАСКАЖА ЧАСОПІС «АЛЕСЯ» Ў ВЕРАСНІ?




### ЖАНЭТ: «Я АРТЫСТКА І ПАВІННА ЗДЗІЎЛЯЦЬ!»

«Людзей заўсёды цікавіць, як прадстаўніца шматдзетнай сям'і змагла дабіцца поспеху. Сваім прыкладам я стараюся паказаць хлопчыкам і дзяўчынкам з такіх сем'яў, што ў жыцці магчыма ўсё! Калі верыць у сябе і ісці наперад, нягледзячы ні на што!» — кажа заслужаная артыстка Рэспублікі Беларусь спявачка Жанэт.

Пра тое, у гонар каго ёй далі такое незвычайнае імя, пра мужа — аднаго з наймацнейшых людзей Беларусі Паўла Сароку; пра тое, як спявачка двойчы выратавала жыццё незнаёмцу, а таксама іншыя цікавыя і маладомыя факты біяграфіі вы даведаецеся, прачытаўшы інтэрв'ю з Жанэт на старонках «Алесі».

### АЛЬБІНА ПАЖАЕВА: «НА ПЕНСІІ ЖЫЦЦЁ ТОЛЬКІ ПАЧЫНАЕЦЦА»

У рубрыцы «Жаночая сіла: змяняць, ствараючы» вас чакае сустрэча з намеснікам старшыні ветэранскай арганізацыі Партызанскага раёна Мінска Альбінай Пажаевай. У свае 83 гады жанчына танцуе, спявае, грае на гітары і выступае на канцэртах. Займаецца нават валанцёрствам: дапамагае ветэранам і дзецям. А яшчэ сочыць за модай і ведае 80 спосабаў прыгожа завязваць шалік. Пра сакрэты яе непадуладнасці ўзросту і жыццярадаснасці; пра тое, як пасля складаных аперацый яна жыве поўным жыццём і натхняе сваім прыкладам іншых, чытайце ў гутарцы з гэтай цікавай жанчынай, адной з пераможцаў рэспубліканскага конкурсу «Жанчына года — 2022».

### КАМІЛЬ КАМАЛ: «СВЕТ БЕЗ ЖАНЧЫНЫ, ЯК ДОМ БЕЗ ДЗВЯРЭЙ»

«Сям'я — гэта і праца, і вялікая адказнасць. Абое, мужчына і жанчына, адказныя за трываласць свайго саюза. «Жонка» ў даслоўным перакладзе з азербайджанскай мовы значыць «сябар жыцця». Той, хто знайшоў сябра жыцця, — шчаслівы чалавек», — упэўнены мастак Каміль Камал.

Яго бацькі — азербайджанцы, нарадзіўся ён у Грузіі, а сям'ю стварыў у Мінску, дзе і жыве ўжо сорак гадоў. Для мастака такая біяграфія — унікальны шанц злучыць у сваёй творчасці культурныя традыцыі Беларусі і Усходу.

Сваімі развагамі пра жыццё, мастацтва, жанчын і каханне Каміль Камал падзяліўся з чытачамі часопіса.

### КАБ ЗНАЙСЦІ КАГОСЬЦІ... ГАТОВЫ ЎВЕСЬ СВЕТ ТЫ АБЫСЦІ?

Хто не марыць сустрэць чалавека дзеля сапраўднага шчасця? Чаму шмат у каго тое не атрымліваецца? Дзе і як сёння лепш знаёміцца? Пра што трэба памятаць, калі хочаш, каб пасля першага спаткання было другое? Якіх спадарожнікаў жыцця сёння жадаюць бачыць побач з сабой жанчыны? І пры якіх умовах можна выбудаваць шчаслівыя працяглыя адносіны? Пра гэта — гутарка з псіхолагам Наталляй Свірыдавай.

### АД ЦЯПЛА ДАБРА НЕ ЧАКАЙ?

Аб новым фактары рызыкі, які адбіваецца на нашым псіхічным самаадчуванні, распавёў нейрахірург, навуковы супрацоўнік аддзялення пухлін галаўнога мозга РНПЦ анкалогіі і медыцынскай радыялогіі імя М. М. Аляксандрава, выкладчык кафедры неўралогіі і нейрахірургіі БелМАПА Гарбаніджад Гумен Гушанг.

### КРАСОЎКІ І ТВІДАВЫ ГАРНІТУР — НЕ ПАРА

Здаецца, час жорсткіх правілаў і патрабаванняў да вонкавага выгляду адышоў у нябыт. Сучасны свет моды ўсё больш памяркоўна ставіцца да таго, як чалавек адзеты. І ўсё ж такі сустракаюцца памылкі, якія відавочна паказваюць адсутнасць густу і псуюць наш вобраз. Чаго ў сваім гардэробе лепш пазбягаць, каб не выглядаць недарэчна? На якія памылкі, промахі сучаснікаў у адзенні звяртаюць увагу спецыялісты? Сваімі назіраннямі на гэты конт дзеліцца дызайнер, магістр мастацтвазнаўства, старшы выкладчык кафедры дызайну моды факультэта сацыякультурных камунікацый БДУ Марына Машэда.

**Вольга ПАКЛОНСКАЯ.**


## Смачная восень са «Звяздой»

Калі вы падпісаліся на газету «Звязда» на IV квартал або на II паўгоддзе 2023 года — запаўняйце картку ўдзельніка, выразайце і дасылайце да 20 кастрычніка 2023 года ў рэдакцыю на адрас: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10а.

Сярод падпісчыкаў будуць разыграны сем міксераў SCARLET SC-HM40S 16 Family Life і суперпрыз — кухонны камбайн Holt HT-FR-002. Вынікі будуць апублікаваны ў газеце да 4 лістапада 2023 года.

Прызы можна будзе атрымаць у рэдакцыі да 31 снежня 2023 года пры падачы квітанцыі аб падпісцы на «Звязду» на IV квартал або на II паўгоддзе 2023 года. Пасля 31 снежня 2023 года выдача прызоў спыняецца і прэтэнзіі падпісчыкаў не прымаюцца. Умовы рэкламнай гульні чытайце ў нумары 161 ад 22 жніўня 2023 года.



**Тэлефоны для даведак: (017) 271-81-53, 311-17-40.**

Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі № 4348 ад 15.08.2023 г. выдадзена Міністэрствам антыманапольнага рэгулявання і гандлю Рэспублікі Беларусь.

**Картка ўдзельніка — падпісчыка «Звязды» на IV квартал або II паўгоддзе 2023 года**

**Прозвішча, імя, імя па бацьку** ______________________

______________________________________________

**Падпіска аформлена і аплачана ў** ______________________
